## Уладзімір ПІЛІПЕНКА:

# «У МАСАВУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ ЭНЕРГАЗБЕРАГАЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НИПТИСА МОЖНА ЎКАРАНІЦЬ ТОЛЬКІ ПАСЛЯ МАДЭРНІЗАЦЫІ ДОМАБУДАЎНІЧЫХ КАМБІНАТАЎ»

**У сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя будаўнічая галіна нашай рэспублікі перажывала крызіс. Значна скараціліся аб'ёмы будаўнічай вытворчасці. Калі ў савецкі час гэты паказчык мог дасягаць 6 млн квадратных метраў у год, то ў 94-м, 95-м ён не перавышаў 1,5—1,6 млн. Не было сродкаў у дзяржавы, не было іх і ў саміх грамадзян. Каб неяк выжыць, будаўнічым арганізацыям даводзілася шукаць заказы за мяжой.**

**З выхадам жыллёвай праграмы Прэзідэнта будаўнічая галіна паступова пачала аднаўляцца. І адразу ўвагу да сябе прыцягнулі дамы БПД (буйнапанэльнага домабудавання), якія да перабудовы складалі 50 працэнтаў у агульным аб'ёме ўсяго ўзводзімага на тэрыторыі рэспублікі жылля.**

### СКЕПСІС НЕ АПРАЎДАЎСЯ

— Вельмі папулярным у сярэдзіне 90-х было меркаванне аб неперспектыўнасці зборнага жылля, яго маральнай састарэласці і неканкурэнтаздольнасці, — расказвае дырэктар УП «Інстытут НИПТИС» Уладзімір Піліпенка. — Асноўным недахопам зборных дамоў была жорсткая планіровачная структура, якая не дазваляла ўзводзіць жыллё пад заказ. Шмат прэтэнзій выклікалі і няякасныя стыкі панэляў, якія часта працякалі. Заўвагі былі цалкам абгрунтаванымі. У тыя часы ў аднойчы распрацаваную серыю дамоў БПД не ўносілі ніякіх мадэрнізацый і дзесяцігоддзямі «штампавалі» адно і тое ж. А невысокая якасць узводзімых дамоў (у тым ліку і дрэнныя стыкі панэляў) тлумачылася зношанасцю абсталявання. Улічыўшы недахопы зборнага жылля, кіраўніцтва галіны нават разглядала пытанне закрыцця домабудаўнічых камбінатаў (ДБК) і пераходу на маналітнае і каркаснае будаўніцтва.

Аднак пры ўсіх сваіх відавочных недахопах зборнае домабудаванне ўсё ж такі мела і шэраг пераваг. У прыватнасці, больш хуткія тэмпы ўзвядзення і — вельмі важны момант — значна меншы сабекошт. Розніца дасягала 30 працэнтаў у параўнанні з маналітным, каркасным і цагельным жыллём.

У рэшце рэшт вырашылі ад БПД не адмаўляцца, а правесці яго мадэрнізацыю. Што і было зроблена, у тым ліку і супрацоўнікамі НИПТИСа. Зараз доля дамоў БПД у агульным аб'ёме жыллёвага будаўніцтва складае 21 працэнт. Прыкладна столькі ж — сельскае жыллё (узвядзенне жылля ў сельскай мясцовасці), астатнія працэнты падзялілі паміж сабой «маналіт» і «каркас».

Сённяшнія дамы БПД значна адрозніваюцца ад сваіх савецкіх прататыпаў. Якасць аздаблення ў іх зусім на іншым узроўні, а галоўнае — забяспечана гібкасць аб'ёмна-планіровачных рашэнняў. Гэта стала магчымым пры ўвядзенні замест унутраных нясучых сцен унутранага каркаса. Прыкладам можа служыць вельмі папулярная зараз серыя 464-М, якую ўзводзіць сталічнае прадпрыемства МАПІД па праекту інстытута «Мінскпраект». Серыя забяспечвае будаўніцтва кватэр пад заказ, дае магчымасць змяняць па жаданню кліента габарытныя памеры кухні, залы, спальні і г.д. Пры гэтым захоўваюцца высокія тэмпы ўзвядзення жылля, характэрныя для КПД, і адносна нізкія цэны.

— Нягледзячы на яўны скепсіс у адносінах да зборнага жылля, які панаваў у 90-х гадах, мы і яшчэ некалькі інстытутаў не спынялі свае работы па ўдасканаленню канструктыўных сістэм БПД, — працягвае Уладзімір Мітрафанавіч. — Менавіта мадэрнізаваныя канструктыўныя сістэмы дазволілі выпусціць 464-ю серыю (распрацоўка «Мінскпраекта»). НИПТИС мадэрнізаваў серыю для Наваполацкага ДБК. Такім чынам, заявы аб неперспектыўнасці і неканкурэнтаздольнасці зборнага жылля, агучаныя ў 90-х, былі адхілены часам і практыкай.

### БУДУЧЫНЯ КАМБІНАТАЎ

Для ўзвядзення якаснага жылля неабходна якаснае абсталяванне. У краіне сёння налічваецца 14 домабудаўнічых камбінатаў (ДБК) — 8 падпарадкоўваюцца Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва, астатнія знаходзяцца ў камунальнай уласнасці аблвыканкамаў. Аднак незалежна ад гэтага становішча на ўсіх 14 камбінатах аднолькава сумнае. Эксплуатуюцца камбінаты па 40—50 гадоў. Прымяняльныя тэхналогіі былі распрацаваныя ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Знос абсталявання складае 86—100 працэнтаў. Адсюль — дрэнныя стыкі панэляў, вялікія страты цяпла падчас эксплуатацыі, нізкая якасць будаўніцтва ўвогуле. Акрамя таго, усе 14 ДБК выпускаюць канструктыўныя сістэмы жорсткай структуры. Пад заказ узводзіць кватэры нельга.

— Апошнія распрацоўкі пераканаўча даказалі, што дамы БПД могуць сёння быць канкурэнтаздольнымі, — гаворыць дырэктар. — Засталося вырашыць, што ж рабіць з домабудаўнічымі камбінатамі. Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва паставіла перад нашым інстытутам задачу знайсці адказ на гэтае пытанне. Мы вывучылі вопыт заходнееўрапейскіх краін і высветлілі, што тэхналогія зборнага домабудавання актыўна развіваецца ў Германіі, Швецыі, Фінляндыі, Іспаніі, Італіі. Пакуль мы эксплуатавалі састарэлыя тэхналогіі, заходнія спецыялісты значна прасунуліся наперад. У прыватнасці распрацавалі гібкія тэхналогіі, якія дазваляюць пераналаджваць абсталяванне пад тыя канструктыўныя сістэмы, якія на дадзены момант ім патрэбны. Мы ўсё яшчэ выкарыстоўваем тэхналогіі, якія даюць магчымасць выпускаць толькі адну распрацаваную канструктыўную сістэму, адступіць хоць на крок ад якой ужо немагчыма з-за жорсткай формы. Арыфметыка простая: адна форма — адзін від вырабаў. З гэтай прычыны на кожным нашым заводзе колькасць формаў дасягае 4,5 тысячы тон. Гэта вельмі высокая металаёмістасць. На заходніх прадпрыемствах гэты паказчык значна меншы. Гібкасць тэхналогій дазваляе на адным паддоне фармаваць розныя віды вырабаў. Увесь працэс там цалкам аўтаматызаваны, кіруецца камп'ютарам. Пры гэтым значна скарачаюцца страты цеплавой энергіі і энергаёмістасць. Прымяняюцца і хімічныя дабаўкі, якія дазваляюць палепшыць якасць бетону. Увогуле пры такім абсталяванні можна вырабляць элементы не толькі для жыллёвага будаўніцтва, але і для ўзвядзення будынкаў сацыяльна-культурнага прызначэння, і вытворчых памяшканняў.

Каб вывесці домабудаўнічыя камбінаты са складанага становішча, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва прыняло праграму іх мадэрнізацыі, якая прадугледжвае ў 2007—2008 гадах правядзенне карэннай мадэрнізацыі ўсіх падначаленых яму заводаў ДБК. Работы плануецца праводзіць па двух накірунках: мадэрнізацыя канструктыўна-тэхналагічных сістэм па кожнаму з ДБК і рэканструкцыя самых ДБК (замена тэхналагічнага абсталявання з арыентацыяй на перадавыя заходнія тэхналогіі).





Варыянт перспектыўных жылых дамоў БПД з унутраным каркасам (серыя 464) на вуліцы Ляшчынскага ў Мінску.

— У мінулым годзе мы даследавалі 8 ДБК, падначаленых міністэрству, — тлумачыць Уладзімір Мітрафанавіч. — Па кожнаму падрыхтавалі аванпраекты з указаннем тэхнічных і тэхналагічных параметраў абсталявання, якое неабходна ўстанавіць для выпуску прадукцыі пад пэўную магутнасць; распрацавалі бізнэс-планы. Ужо гатова адпаведная дакументацыя для правядзення тэндэраў на пастаўку абсталявання. Прычым міністэрствам была пастаўлена задача — пры пастаўцы абсталявання забяспечыць умовы прыцягнення айчынных машынабудаўнічых прадпрыемстваў для выраба асобных элементаў.

Сёння на практыцы прымяняюцца чатыры канструктыўна-тэхналагічныя сістэмы пабудоў, якія выпускаюць заводы ДБК, падначаленыя міністэрству:

— 90-я серыя з рознымі мадэрнізацыямі (выпускаецца ў Наваполацку, Барысаве, Бабруйску, Магілёве, Мінску);

— 108-я серыя (выпускаецца Віцебскім ДБК);

— 152-я серыя (Гомельскі ДБК);

— серыя Салігорскага і Светлагорскага камбінатаў.

Адпаведна па чатырох накірунках праводзіцца і мадэрнізацыя канструктыўных сістэм будынкаў: для 90-й серыі плануецца ўвядзенне ўнутранага каркаса; для 108-й серыі разглядаюцца два варыянты (унутраны каркас і прымяненне пліт пустотнага насцілу); для светлагорска-салігорскай серыі прадугледжаны зборны каркас з навяснымі панэлямі; 152-я серыя будзе мадэрнізавана. Усе новыя варыянты серый прадугледжваюць паляпшэнне сваіх цеплатэхнічных характарыстык.

У акрэсленым накірунку зараз і працуе НИПТИС.

### ЗМЯНІЦЬ ПСІХАЛОГІЮ

Існуе і другі блок задач, пастаўленых перад інстытутам і звязаных непасрэдна з пераўзбраеннем і рэканструкцыяй саміх прадпрыемстваў ДБК, — удасканаленне тэхналогій вытворчасці. Тут таксама маецца некалькі варыянтаў, звязаных з тымі канструктыўна-тэхналагічнымі сістэмамі будынкаў, якія выпускаюць камбінаты.

Па першаму варыянту праводзіцца абмежаваная мадэрнізацыя прадпрыемства з мэтай аднаўлення тэхналагічнага абсталявання і нарошчвання магутнасцяў па выпуску асвоеных раней канструктыўна-тэхналагічных сістэм жылых будынкаў. Гэта менш затратны варыянт прымяняльна да дзеючай вытворчасці. Па другому варыянту заводы БПД перапрафілююцца на выпуск шыракакорпусных жылых дамоў з гібкай планіроўкай кватэр па змешанай каркасна-сценавой канструктыўнай сістэме. Асноўнымі вертыкальнымі нясучымі элементамі з'яўляюцца калоны, вонкавыя сценавыя панэлі, панэлі ўнутраных сцен, якія ўтвараюць лесвічны ці лесвічна-ліфтавы вузел. Гарызантальныя нясучыя элементы — плоскія суцэльныя пліты перакрыццяў БПД, якія абапіраюцца на панэлі вонкавых сцен і на аднапавярховыя калоны ў сярэдзіне будынка. У новай канструктыўнай сістэме вырашаюцца і пытанні энергазберажэння. Толькі павелічэнне шырыні корпуса да 15—16 метраў зніжае ўдзельны расход цяпла да 25 працэнтаў пры аднолькавых цеплатэхнічных паказчыках абмежавальных канструкцый, што дазваляе паменшыць сабекошт 1 квадратнага метра на 10—15 працэнтаў. Трэці варыянт найбольш радыкальны. Ён прадугледжвае асваенне каркаснай канструктыўна-тэхналагічнай сістэмы, што патрабуе большай ступені пераабсталявання заводаў БПД. У гэтым выпадку неабходны пераход на канвеерныя ці паўканвеерныя лініі вытворчасці пліт перакрыццяў, калон, аблегчаных канструкцый вонкавых сцен. Чацвёрты варыянт прадугледжвае арганізацыю будаўніцтва шыракакорпусных жылых дамоў да 9 паверхаў па спрошчанай гібкай канструктыўна-тэхналагічнай сістэме. Канструкцыя жылога дома рашаецца па сістэме буйнапанэльных будынкаў з нясучымі ўнутранымі папярочнымі і падоўжнымі сценамі са зборных жалезабетонных панэляў і перакрыццямі са шматпустотных пліт.

Работы па абодвух накірунках мадэрнізацыі праводзяцца НИПТИСам паралельна, пад пільным кантролем міністра.

— Неабходна яшчэ змяніць і псіхалогію саміх работнікаў домабудаўнічых камбінатаў, — адзначае Уладзімір Мітрафанавіч. — Пераарыентаваць яе на ўспрыманне сучасных тэхналогій (што не заўсёды атрымліваецца хутка). Людзі прывыклі працаваць па старых звычаях, пра многія навінкі яны нават не чулі. Таму разам з работамі па праектаванню мы праводзім прафесійны лікбез персаналу ДБК. Арганізуем выезды на перадавыя прадпрыемствы Швецыі, Фінляндыі, Італіі. Станоўчыя вынікі ўжо адчувальныя. Нашы спецыялісты ўбачылі, як можна наладзіць вытворчы працэс, і захацелі ўкараніць такое і ў сябе.



Галоўны інжынер інстытута Збігнеў Баляслававіч МІЦКЕВІЧ.

### ПЛЮС ЭКАНОМІЯ ЦЯПЛА

Яшчэ ў 2004 годзе нарматывы страт цеплавой энергіі жылога дома ў нас і на Захадзе былі прыблізна аднолькавымі. Але з прыняццем Дырэктывы 2002/01 у заходніх краінах гэты паказчык быў зменшаны на 30 працэнтаў. Патрабаванні да эканоміі энергіі ўзраслі. Пытанне змянення нарматываў страт цеплавой энергіі будынка разглядаецца і ў нас. НИПТИС ужо распрацаваў канкрэтны варыянт цёплага дома БПД, дзе задача эканоміі энергіі вырашана ў комплексе. Там прадугледжана сістэма прымусовай вентыляцыі, цёплая сталярка, шматслойнае ўцяпленне сцен з дадатковым уцяпленнем тарцовых кватэр першага і апошняга паверхаў. Эксперыментальны дом ужо будуецца ў раёне Каменнай Горкі. Плануецца, што энергазатраты пры яго эксплуатацыі будуць меншымі ўтрая ў параўнанні з іншымі дамамі БПД.

— На прыкладзе гэтага дома мы хочам прадэманстраваць у дзеянні свае новыя энергазберагальныя тэхналогіі, — адзначыў у завяршэнні размовы Уладзімір Піліпенка, — але ў масавую вытворчасць іх можна будзе ўкараніць толькі пасля мадэрнізацыі заводаў ДБК.

**Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

**УП «Інстытут НИПТИС»:**

**220114 г. Мінск, Старабарысаўскі тракт, 15. Тэл. 263-81-91. Факс 263-51-21.**

# БОЛЬШ ЯК ПАЎВЕКА Ў НАВУКОВЫМ СТРАІ

*Акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатолю Герасімавічу ШАШКОВУ — 80 гадоў*

28 лютага 2007 года спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння выдатнага вучонага-цеплафізіка, акадэміка НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі, доктара тэхнічных навук, прафесара Анатоля Герасімавіча Шашкова.

Акадэмік А.Г. Шашкоў — адзін са старэйшых супрацоўнікаў Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава НАН Беларусі. Яго працоўная дзейнасць у Акадэміі навук СССР (энергасектар Інстытута торфу) пачалася ў 1949 годзе пасля завяршэння вучобы ў Сярэднеазіяцкім політэхнічным інстытуце. У Акадэміі навук рэспублікі А.Г. Шашкоў прайшоў шлях ад інжынера да акадэміка, буйнога вучонага, чые дасягненні шырока прызнаныя ў навуковым свеце. З самага пачатку сваёй работы Анатоль Герасімавіч творча ўзаемадзейнічае з навуковай школай, створанай у інстытуце аўтаматыкі і тэлемеханікі АН СССР, актыўна займаецца даследаваннямі сістэм аўтаматычнага рэгулявання агульнага прызначэння, спецыялізаваных для прымянення ў цеплатэхніцы, энергетыцы і навуковым эксперыменце. У 1955 годзе А.Г. Шашкоў абараняе кандыдацкую дысертацыю, а ў 1964-м — доктарскую, якая з'явілася буйным этапам у даследаваннях нелінейных ланцугоў у сетках з тэрмістарамі.

У 1970 годзе Анатоль Герасімавіч абіраецца членам-карэспандэнтам АН БССР, а ў 1980-м — акадэмікам АН БССР. Навуковыя ідэі і задумы вучоны рэалізоўвае сумесна са сваім навуковым калектывам — лабараторыяй цеплафізікі. Тэматыка распрацоўваемых даследаванняў адрозніваецца высокай актуальнасцю і арыгінальнасцю. Анатоль Герасімавіч Шашкоў правёў вялікія даследаванні ў сферы вывучэння цеплафізічных уласцівасцяў газаў, вадкасцяў і цвёрдых целаў у шырокім дыяпазоне параметраў, працэсаў пераносу ў газах і газавых сумесях, стварэння новых метадаў даследавання цеплафізічных уласцівасцяў рэчываў, у тым ліку пры наяўнасці фазавых і хімічных пераўтварэнняў, метадаў ідэнтыфікацыі цеплафізічных характарыстык, сістэмна-структурных падыходаў да вывучэння заканамернасцяў з'яў цепла- і масапераносу, новых шляхоў атрымання і пераўтварэння энергіі. Прыкладныя распрацоўкі А.Г. Шашкова і створанай ім навуковай школы паспяхова ўкаранёныя ў шэрагу галін прамысловасці, адной з найбольш эфектыўных распрацовак стала стварэнне новых рабочых сумесяў для электралямпавай прамысловасці (Брэсцкі і Саранскі электралямпавыя заводы).

А.Г. Шашкоў — аўтар 16 кніг, якія атрымалі шырокае распаўсюджанне і перавыдаваліся ў шэрагу краін. Сярод кніг, выдадзеных А.Г. Шашковым асабіста і з вучнямі і калегамі, можна адзначыць «Ваганні ў ланцугах з тэрмістарамі», 1963; «Тэрмарэзістары і іх прымяненне», 1967; «Сістэмна-структурны аналіз працэсу цеплаабмену і яго прымяненне», 1983; «Цеплаправоднасць газавых сумесяў», 1970; «Метады вызначэння цеплаправоднасці і тэмператураправоднасці», 1973; «Цепла- і масаабмен у патоку нагрэтага газу», 1974; «Цеплаабмен у электрадугавым награвальніку газу», 1974; «Цеплафізіка аптычных асяроддзяў», 1983; «Цеплафізіка матэрыялаў, якія раскладаюцца», 1985 і інш. Толькі ў 1996 годзе выйшлі дзве манаграфіі — А.Ф. Шленскі, Н.В. Афанасьеў, А.Г. Шашкоў «Тэрмаразбурэнне матэрыялаў» (М.,Энергаатамвыд) і А.Г. Шашкоў, В.А. Бубноў, С.Ю. Яноўскі «Хвалевыя з'явы цеплаправоднасці» (20,0 п.л., КНР — пераклад на кітайскую мову) і інш.



Ва ўсе працы Анатоль Герасімавіч Шашкоў укладвае талент выдатнага вучонага, энцыклапедычныя веды, імкненне пазнаваць і тлумачыць, зрабіць навуку рухаючай сілай прагрэсу. Акадэмік А.Г. Шашкоў унёс вялікі ўклад у ператварэнне і развіццё Інстытута цепла- і масаабмену НАН Беларусі, ператварэнне яго ў буйнейшы цэнтр навукі аб цепла- і масапераносу. У апошнія гады ўвагу вучонага займаюць новыя праблемы цеплафізікі — распрацоўка новых прынцыпаў і структурных падыходаў да пабудовы тэорыі цепла- і масапераносу ў асяроддзі складанага агрэгатнага стану, сінергетычных вымярэнняў і прыбораў, якія іх забяспечваюць.

У асобе юбіляра выключна спалучаюцца якасці вялікага вучонага і арганізатара навукі, выхавальніка і настаўніка, вучонага маштабных задум і рэдкае пачуццё новага, што дазваляе Анатолю Герасімавічу на працягу ўсяго часу актыўна і плённа весці навукова-педагагічную работу. Ён падрыхтаваў 43 кандыдаты навук, многія з яго вучняў сталі дактарамі навук, разам з акадэмікам Аляксеем Васільевічам Лыкавым стварыў базавую кафедру цеплафізікі (цяпер энергафізікі) у Беларускім дзяржаўным універсітэце, быў старшынёй і з'яўляецца членам спецыялізаваных саветаў па абароне дысертацый. Вядзе вялікую і плённую навукова-арганізацыйную работу ў шэрагу навуковых саветаў, рэдакцыях часопісаў (дастаткова ўспомніць шматгадовую работу па кіраўніцтву «Інжынерна-фізічным часопісам»), актыўна ўдзельнічае ў міжнародным навуковым супрацоўніцтве.

Калегі і вучні, сябры шчыра зычаць Анатолю Герасімавічу Шашкову новых творчых здзяйсненняў, рэалізацыі вылучаных ідэй і задум, моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.

**С. АСТАПЧЫК, акадэмік НАН Беларусі,**
**В. ДРАГУН, член-карэспандэнт НАН Беларусі.**

**БЕЛАРУСБАНК**

**АСБ «Беларусбанк» информирует, что**

*с 1 марта 2007 года*

***ИЗМЕНЯЮТСЯ ПРОЦЕНТНЫЕ СТАВКИ***

*по вновь выдаваемым физическим лицам кредитам.*

Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении АСБ «Беларусбанк» или на веб-сайте банка

**www.belarus-bank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

## Сёння

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.01 | 17.44 | 10.43 |
| Віцебск — | 6.53 | 17.32 | 10.39 |
| Магілёў — | 6.52 | 17.34 | 10.42 |
| Гомель — | 6.46 | 17.33 | 10.47 |
| Гродна — | 7.16 | 17.59 | 10.43 |
| Брэст — | 7.15 | 18.02 | 10.47 |

### Месяц

***Першая квадра 24 лютага.***
***Месяц у сузор'і Льва.***

### Імяніны

***Пр.*** *Ефрасінні, Сафіі, Анісіма, Аўсея, Івана, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*
***К.*** *Антаніны, Людмілы, Антона, Рамана, Макара.*

## Надвор'е на заўтра




Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

### ...у суседзяў

| | | | |
|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +6 — +8 °С | МАСКВА | -4 — -2 °С (Без ападкаў) |
| ВІЛЬНЮС | 0 — +2 °С | РЫГА | 0 — +2 °С (Без ападкаў) |
| КІЕЎ | 0 — +2 °С | С-ПЕЦЯРБУРГ | -2 — 0 °С |

Па-за кадрам

# ТРЭНІРАВАЎСЯ, УПАЎ, АПРЫТОМНЕЎ — ГІПС...

Нейкі злы лёс праследуе вядучых канала АНТ у цыркавым тэлепраекце. Спачатку Сяргей Савіцкі, рыхтуючы джыгітоўку на вярблюдах, упаў і пашкодзіў нагу настолькі сур'ёзна, што вымушаны быў пакінуць праект. Урачы лічаць, што гэта ўсё ж не перелом, а разрыў звязак, але ні Сяргею, ні яго балельшчыкам ад гэтага лягчэй не стала. І вось — новая непрыемнасць. У пятніцу вечарам падчас рэпетыцыі на падкідной дошцы парваўся страховачны трос. Наталля Радзіна паламала левую руку. У бальніцы высветлілася, што перелом цяжкі, закрыты, са змяшчэннем, упраўляць косці давялося пад наркозам, а зараз дзяўчына напалову закаваная ў гіпс.

Тэлевядучая, такім чынам, пакідае шоу. Аднак гэта не здымае дамоклава мяча над двума намінантамі — Паўлам Кежой і Віктарам Арцёмавым. Бо замяніць Наташу ў рэаліці-шоу добраахвотна вызваўся яе напарнік па ранішняй праграме Сяргей Дарафееў. Паколькі праект ліцэнзійны, паведамілі нам у прэс-службе АНТ, канал не можа самастойна мяняць яго фармат, — запыт аб прыняцці рашэння накіраваны ў кампанію «Эндэмол», якая распрацоўвала шоу. Адказ чакаецца прыкладна ў сераду — і якраз у гэты дзень завяршаецца глядацкае галасаванне, якое вырашыць, каму застацца, а каму пакінуць «Зорны цырк». І да фінішу праекта застаецца менш як 2 тыдні... Каму тут яшчэ не хапае напалу страсцей?

Як ні жорстка гэта прагучыць, шоу павінна працягвацца. Першы шок паслабеў — і астатнія ўдзельнікі рэпеціруюць свае нумары. Люся Лушчык працуе над ілюзіёнам, Георгій Волчак — над клаўнадай. Вячаслаў Харанэка плануе падскокваць на банжах, Юрый Каштанаў і Алена Грышанава — на батутах. Павел Кежа дрэсіруе сабачак. Віктар Арцёмаў выконвае акрабатычны нумар на рамянях. Але ніводны з іх не можа быць упэўнены, што ў наступны раз страхоўка не падвядзе менавіта яго. У цырку сцвярджаюць, што траўма Наталлі Радзінай — з разраду выпадкаў «адзін на мільён». Але, паводле чутак, збіраюцца паклікаць свяшчэнніка. На ўсякі выпадак. У дапамогу да тэорыі верагоднасці?..



### АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

***Таццяна БАНДАРЧУК, дырэктар Белдзяржцырка, дырэктар «Зорнага цырка»:***

— Мне вельмі шкада, што гэта здарылася менавіта з Наташай. Бо пасля нумара з дрэсурай мядзведзя яна мне як родная. І я вельмі спадзявалася, што Наташа дойдзе да фіналу.

Наташа ўпала з невялікай вышыні — проста прызямлілася няўдала, на руку. Натуральна, усіх канкурсантаў вучаць груміравацца і прызямляцца. Але ў цыркавых артыстаў гэта ўменне адточваецца гадамі і даходзіць да аўтаматызму, так што Наташу нельга вінаваціць. Наогул, у той час на манежы прысутнічала толькі яна і акрабаты, якія падказвалі элементы, так што няма сярод каго шукаць вінаватых...

Наш інжынер па тэхніцы бяспекі працуе ў цырку ўжо 16 гадоў, і за гэты тэрмін ніводнага падобнага выпадку не было. Трос, у прынцыпе, можа вытрымаць вагу ў 6 разоў большую, чым важыць Наташа Радзіна. Прычым трос новы, набыты нядаўна, так што мы адправілі яго на экспертызу. Як высветлілася, справа ў тэхнічным браку — унутры, паміж валокнамі, у адным месцы была пустата, там трос і лопнуў...

Яшчэ хачу адзначыць, што ў «Зорным цырку», на жаль, змянілася абстаноўка — у сэнсе дысцыпліны. Большасць удзельнікаў лічаць, што яны ўжо самастойныя і прафесійныя, таму лёгка пераносяць час трэніровак, ускладняюць элементы, адсцёгваюць страхоўку... Я размаўляла на гэты конт з Ягорам Хрусталёвым і прапанавала прыняць, што слова трэнера — закон, а калі ўдзельнік парушае дысцыпліну — яго трэба выдаляць з праекта. Гэта будзе жорстка, але справядліва, і больш бяспечна для ўсіх.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».**
**Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.**
**Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1152. Нумар падпісаны ў 19.30.**
**М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**
**П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12**